ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

_____________Ю.П.Голубеў
20 кастрычніка 2025 г.

# ВОДЗЫЎ

апаніруючай арганізацыі аб дысертацыі
Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны
"Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору
на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі",
прадстаўленай у савет па абароне дысертацый Д 02.21.02
пры дзяржаўнай установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання
(вучнёўскай і студэнцкай моладзі)

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі**

Дысертацыя Н.У. Мурашкі "Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі" выканана па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі); галіна навукі – педагагічная. Змест дысертацыі поўнасцю адпавядае ўказанай спецыяльнасці і названай галіне навукі.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці**

У дысертацыі Мурашкі Н.У. даследавана праблема працы настаўніка пачатковых класаў у плане яе арганізацыі з мэтай фарміравання маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору. Разгледжаны аспекты ўдасканалення падыходаў і тэхналогія вывучэння беларускай народнай творчасці на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Вывады і навуковыя палажэнні дысертацыі – несумненны ўклад аўтара дысертацыі ў сферу, недастаткова вывучаную і да канца не распрацаваную айчыннай педагогікай.

Несумненным навуковым укладам у вырашэнне навуковай задачы мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя выступае сканструяваная аўтарам дысертацыі структурна-функцыянальная мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору ў школах з рускай мовай навучання і выхавання. Адзначаная мадэль звязана з актуальнай навуковай патрэбай метадычнай распрацоўкі тэорыі вывучэння народнай творчасці ў школе з мэтай развіцця маўлення і выклікана неабходнасцю знаходжання лінгваметадычных алгарытмаў вырашэння пытанняў непасрэднага знаёмства школьнікаў з канкрэтнымі фальклорнымі творамі. Распрацоўка навуковай праблемы ў дысертацыі ажыццяўляецца з апорай на аўтарытэтныя навуковыя крыніцы, прысвечаныя школьнай педагогіцы, і інстытуцыянальныя палажэнні адпаведных дакументаў сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Выкананы ў дысертацыі навуковы аналіз матэрыялу, а таксама дэскрыптыўныя падыходы, якія ажыццяўляюцца ў працы, з'яўляюцца, несумненна, эфектыўнымі і педагагічна перспектыўнымі. Яны ўзбагачаюць айчынную методыку інавацыйнымі тэхналогіямі, спрыяюць вырашэнню спрэчных пытанняў методыкі і тэхналогіі ўдасканалення навучання ў пачатковай школе. Не толькі пастулюецца пералік несумненных сентэнцый, але і доказна абгрунтоўваюцца палажэнні, якія маюць значэнне ў школьнай практыцы, а таксама адкрываюць перспектыву стварэння новых навуковых парадыгм развіцця маўлення праз вывучэнне фальклорных твораў у школе на падставе існуючых практычных распрацовак і тэарэтычных палажэнняў.

Аднак, 1) у дысертацыі "сканструявана структурна-функцыянальная мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору" (с. 131). Ёсць сумненні ў апраўданасці адзначанага мадэлявання. Мадэль у сілу свайго сутнаснага статусу не павінна мець структурна-функцыянальных уласцівасцей, а валодаць толькі характэрнымі для рэаліі рысамі. Школьная мадэль – гэта не структурна арганізаванае ўтварэнне, звязанае з канстуктыўна-працэсуальнай педагагічнай дзейнасцю, а віртуальны аналаг (інструмент) пазнання і рэалізацыі стану навучання, які не адбываецца як працэс, а ажыццяўляецца "па ходу" – праходзіць (*"ход урока"*, а не *"працэс урока"*). Мадэлюецца (і праектуецца) гарманічная архітэктоніка ўсяго, а не структурна арганізаваная сістэма ("разнавіднасць").

Мэта "ўдакладніць сутнасці маўленчага адукацыйнага асяроддзя" (с. 8), гучыць сімулятыўна ў сілу не экзістэнцыянальнай (*existential* існаванне') прыроды сутнасці (*essentia*). Сутнасць чагосьці не ўдакладняецца паслядоўна, а паступальна набліжаецца да рэцыпіента. Гэта рэжым пасвячэння і канкрэтызацыі, а не механізм лагічна ўпарадкаванага ўдакладнення.

2. У дысертацыі "выяўлены і абгрунтаваны патэнцыял фальклору як сродку мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя" (с. 130). Узнікае пытанне: ці апраўдана гаварыць пра "патэнцыял фальклору" і ўжываць адпаведны тэрмін. Творчасць не з'яўляецца мэтава актуалізаванай ці

непраяўленай (патэнцыяльнай) дзейнасцю. Гэта надзённы акцэнтавана-інтэнцыянальны стан чалавечай свядомасці. Гэты стан не патрабуе валявой стымуляцыі, аднак не абыходзіцца без творчага апеляцыйнага імпульсу (парыву, пазыву, імпэту). У святле адзначанага, думаецца, не варта сцвярджаць існаванне "патэнцыялу фальклору", а прызнаваць яго невычарпальны жыватворны *рэсурс*.

3. Сцвярджаецца, што структура маўленчага адукацыйнага асяроддзя прадстаўлена ўзаемазвязанымі кампанентамі (матывацыйным, кагнітыўным, дзейнасным, рэфлексіўным). Калі кагніцыя і дзейнасць сапраўды прадстаўлены ў арганізацыйных структурах, то такога, аднак, не скажаш пра "матывацыйнасць" і "рэфлексіўнасць". Гэтыя складнікі не прадстаўляюцца дэманстратыўна, а маніфестуюцца (прад'яўляюцца) – знаходзяцца, выступаюць, выяўляюцца. Матывацыя нічога не чыніць – не "пабуджае вучняў размаўляць" (с. 130), г. зн. не стымулюе, а нязмушана ўплывае і схіляе (ініцыіруе) іх вербальныя паводзіны. Для размовы не патрабуецца прычына, аднак неабходна зачэпка. Аналагічна і рэфлексію, думаецца, таксама не варта ставіць у адзін рад з дзейнасцю і кагнітыўнасцю. Гэта не рэакцыя на ўздзеянне, а незалежны ад актыўнага волевыяўлення водгук на ўражанне ў рэжыме ўспрымання мастацкага твора.

4. Супярэчлівымі, на наш погляд, з'яўляюцца ўжытыя ў дысертацыі наступныя слоўныя спалучэнні:

"сродкі фальклору". Стан творчасці не патрабуе сродкаў, аднак не абыходзіцца без *інструментаў* – сэнсаўтваральных эфектыўных прылад;

"індыкатар выніковасці". Выніковасць не індукуецца (прад'яўляецца), а паказваецца (дэманструецца).

"алгарытм фарміравання". Алгарытмізуючы, не фарміруюць паняцці, а лагістычна даходзяць да сутнасці рэчаў.

"з улікам практыка-арыентаванасці…". Практыка не арыентавана, а выбарча накіравана. Арыенцір – велічыня вектарная (пошукавая).

Выказаныя заўвагі гавораць аб недастатковай вырашанасці ў існуючых сучасных навукова-метадычных працах пытанняў, прысвечаных разгляду і інтэрпрэтацыі аспекту мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору. Заўвагі эксперта ў цэлым не змяншаюць навуковага ўкладу аўтара дысертацыі ў распрацоўку значнай і актуальнай для педагагічнай навукі праблемы лінгвапедагагічнага даследавання і мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Дысертацыя і аўтарэферат аформлены згодна з патрабаваннямі Інструкцыі ВАК як у плане зместу і навуковага апарату, так і ў адносінах да тэхнічнага боку.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана навуковая ступень, на якую ён прэтэндуе**

У працэсе навуковага аналізу фактычнага матэрыялу, які мае дачыненне да тэмы і праблемы даследавання, а таксама ў ходзе мадэлявання і інтэрпрэтацыі сітуацый, што тычацца школьнага маўленчага адукацыйнага асяроддзя, у дысертацыі прыведзены разгорнутыя адказы на ўзнятыя пытанні з улікам вопыту выкладання фальклорных твораў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі" і змяшчаюцца пераканаўчыя навуковыя вынікі.

1. Зроблена спроба вызначэння і тлумачэння прыроды паняцця "маўленчае адукацыйнае асяроддзе", якое акрэсліваецца структурна-функцыянальна, г.зн. як разнавіднасць адукацыйнага асяроддзя, і канструіруецца з мэтай "фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі як якаснага паказчыка маўленчай і камунікатыўнай дзейнасці малодшых школьнікаў" (с. 130). Аўтарам даказваецца палажэнне, у адпаведнасці з якім маўленчае адукацыйнае асяроддзе вызначаецца і структурыруецца адпаведнымі сістэмнаўтваральнымі адзінкамі і катэгорыямі. Такімі "складальнікамі" маўленчага адукацыйнага асяроддзя, як лічыць аўтар, з'яўляецца дзейнасць суб'ектаў адукацыйнага працэсу – актыўны ўдзел вучняў у працэсе зносін і камунікацыі, функцыянаванне беларускай мовы, а таксама арганізацыя навучання і выхавання, накіраванага на фарміраванне асобы і моўнай карціны свету вучняў.

Новым з'яўляецца вызначэнне функцыянальных асаблівасцей маўленчага адукацыйнага асяроддзя, якія прадстаўлены ў дадзенай адукацыйнай структуры, а таксама вывад адносна таго, што названыя функцыянальныя асаблівасці скіраваны на адзіную мэту фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў. Практычная значнасць ідэі адзінай камунікатыўнай прасторы функцыянавання беларускай мовы ў школе бачыцца ў магчымасці выкарыстання адзначанага палажэння дысертацыі ў практыцы выкладання мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах.

2. Аўтарам дысертацыі прааналізаваны магчымасці фальклору як сродку фарміравання маўленчага адукацыйнага асяроддзя. Пераканаўча абгрунтоўваецца, што фальклорныя творы спрыяюць ініцыяцыі творчасці вучняў у аспекце выяўлення іх аўтарскай аўэнтычнасці, наратыўнасці і таленту. Слушным падаецца думка дысертанта пра тое, што станаўленне моўнай асобы кожнага вучня ажыццяўляецца пры ўмове натуральнасці і беспрымусовасці збоку настаўніка. Настаўнікам пачатковай школы, на думку аўтара, варта не забываць этычны бок навучання, усведамляць важнасць асэнсавання народнай творчасці збоку існуючых у грамадстве маральных каштоўнасцей, сацыяльных стэрэатыпаў і адвечных гуманітарных вартасцей. Не пазбаўлена таксама навізны ўвасобленая ў дысертацыі думка аб ракурсах мадэлявання маўленчага асяроддзя. Паводле аўтара, дамінантай у гэтай сферы выступае матыў, які

карэспандуе з кантэнтам і эталогіяй (паводзінамі) вучняў. Адзначанае не толькі ўдакладняе веды адносна арганізацыі агульнаадукацыйнага працэсу навучання дзяцей малодшага школьнага ўзросту, але і пашырае поле дасведчанасці настаўніка, рэлевантнае для знаёмства вучняў з беларускай народнай творчасцю.

3. Цікавасць для школьнай педагогікі ўяўляе сканструяваная аўтарам дысертацыі структурна-функцыянальная мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору ў школах з рускай мовай навучання і выхавання. У структуру адзначанай мадэлі, як лічыць дысертант, уваходзіць рад кампанентаў (матывацыйны, кагнітыўны, дзейнасны, рэфлексіўны), якія выдзелены з улікам актуальна існуючых функцый школьнага маўленчага адукацыйнага асяроддзя. Новым з'яўляецца выдзяленне ў дысертацыі шэрагу структурна ўпарадкаваных блокаў, якія суадносяцца з арганізацыяй дыскурсіўнай дзейнасці (працэсуальнасць, мэтавасць, выніковасць рэгулятыўнасць, змястоўнасць, кагнітыўнасць). Як сведчаць дакументальна афармленыя дадаткі да дысертацыі, адзначаная мадэль з поспехам выкарыстоўвалася ў практыцы выкладання мовы і літаратурнага чытання ў пачатковай школе. Думаецца, што вопыт яе выкарыстання заслугоўвае дальнейшага пашырэння і яшчэ больш строгай тыпалагічнай усталяванасці.

4. Упершыню дэталёва распрацавана і праверана на практыцы модульная методыка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у працэсе вывучэння фальклорных твораў. Дадзеная методыка вызначаецца ў якасці механізма функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя і адкрывае перспектыву яго практычнага стварэння сродкамі фальклору ва ўмовах устаноў адукацыі з рускай мовай навучання. Модульны падыход, які ўключае тры модулі (аналітыка-дыягнастычны, змястоўна-дзейнасны і рэсурсна-падтрымліваючы), аказваецца прыдатным для выяўлення маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў, алгарытмізацыі этапаў яе станаўлення ў ходзе знаёмства дзяцей з фальклорнымі творамі ў рэжыме класнай і пазакласнай працы пры ўмове выкарыстання адэкватных тэхналогій інтэрпрэтацыі гэтых твораў на кожным этапе, прагназавання забяспечанасці маўленча-камунікатыўнага асяроддзя неабходнымі рэальнымі і віртуальнымі рэсурсамі, верагоднасці яго граматнага праектавання і інструментавання (эмацыянальная атмасфера заняткаў, добразычлівасць, эмпатыя).

Нельга не пагадзіцца з прыдатнасцю для пачатковай школы распрацаванага і апрабаванага аўтарам метадычнага забеспячэння фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў сродкамі фальклорных твораў. Несумненна, праграма аб'яднання па інтарэсах, метадычныя дапаможнікі і метадычныя рэкамендацыі, мультымедыйныя прэзентацыі і раздатачныя матэрыялы да іх, сцэнарыі правядзення беларускіх народных святаў і абрадаў, аўтарскі сайт – усё гэта

аказвае і, несумненна, акажа ў далейшым станоўчы гуманітарны ўплыў на ажыццяўленне, станаўленне і праектаванне аспектаў валодання роднай мовай і асэнсаванне фальклорных скарбаў дзецьмі малодшага школьнага ўзросту.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Вынікі экспертызы дысертацыйнага даследавання "Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі" пераконваюць, што яе аўтар, Мурашка Наталля Уладзіміраўна, валодае неабходнай для сучаснага вучонага навуковай кваліфікацыяй – грунтоўнай педагагічнай і лінгвістычнай кампетэнцыяй, навыкамі самастойнага правядзення навуковага даследавання. Кваліфікацыя саіскальніка адпавядае вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.

Лічым, што ў адпаведнасці з патрабаваннямі пунктаў 19, 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь, вучоную ступень кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі) рэкамендуецца прысудзіць Мурашцы Наталлі Уладзіміраўне за:

– прапанаваную і абгрунтаваную мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў школах з рускай мовай навучання і выхавання, якая абапіраецца на сучасныя псіхолага-педагагічныя даследаванні і скіраваная на фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў пачатковых класаў;

– выяўленне і асэнсаванне кантэнту беларускіх фальклорных крыніц, прыдатных да інавацыйнага выкарыстання ў школьнай працы, гуманізацыі адукацыі і станаўлення творчай постаці вучняў – іх крытычнага мыслення, упэўненасці, матываванасці;

– распрацаваную і апрабаваную ва ўмовах пачатковай школы модульную методыку фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў і станаўлення іх граматнасці шляхам стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя і яго метадычнага забеспячэння;

– аўтарскі ўклад ва ўзбагачэнне вопыту эфектыўнага выкарыстання народнай творчасцю ў школе на фоне крытычнага асэнсавання актуальна існуючых айчынных практык і вучэбна-метадычных парадыгм працы настаўніка пачатковай школы.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання**

Прадстаўленае да абароны дысертацыйнае даследаванне змяшчае вынікі, якія ў сваёй сукупнасці могуць знайсці тэарэтычнае і практычнае прымяненне ў педагогіцы вышэйшай школы і ў школьнай практыцы выкладання. Сфармуляваныя аўтарам навуковыя палажэнні могуць быць рэкамендаваны для выкарыстання ў вопыце навучання малодшых школьнікаў, а таксама ў

далейшых распрацоўках алгарытмаў асэнсавання фальклорных твораў дзіцячай свядомасцю і распрацоўцы парадыгм сістэматызаванага вывучэння беларускай народнай творчасці ў пачатковай школе.

**Заключэнне**

Дысертацыйнае даследаванне Наталлі Уладзіміраўны Мурашкі "Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі" адпавядае ўстаноўленым патрабаванням пунктаў 19, 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь. Водзыў заслуханы, абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні навуковага сходу ўстановы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна 17 кастрычніка 2025 года (пратакол № 1).

На пасяджэнні навуковага сходу прысутнічала саіскальнік вучонай ступені Н.У. Мурашка, якая выступіла з дакладам па тэме дысертацыі, прыняла ўдзел у навуковай дыскусіі па закранутых у дысертацыі праблемах, паказала добрае веданне прадмета і кампетэнтнасць як у палажэннях, сфармуляваных у дысертацыі, так і ў агульнай праблематыцы вывучэння народнай творчасці ў пачатковай школе.

На навуковым сходе прысутнічалі: дактароў педагагічных навук – 1, дактароў філалагічных навук – 1, кандыдатаў педагагічных навук - 9, кандыдатаў філалагічных навук – 5.

Вынікі галасавання ўдзельнікаў навуковага сходу па зацвярджэнні водзыва апанірyючай арганізацыі аб дысертацыйнай працы Н.У. Мурашкі:

«за» – 16,
«супраць» – няма,
«устрымаліся» – няма.

Старшыня навуковага сходу –
загадчык кафедры методык дашкольнага
і пачатковага навучання
ўстановы адукацыі «Брэсцкі
дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна»,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт — А.Я. Леванюк

Эксперт –
прафесар кафедры методык дашкольнага
і пачатковага навучання,
ўстановы адукацыі «Брэсцкі
дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна»,
доктар філалагічных навук, прафесар — В.І. Сянкевіч

Сакратар навуковага сходу –
дацэнт кафедры методык дашкольнага
і пачатковага навучання,
ўстановы адукацыі «Брэсцкі
дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна»,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Ю.А. Капцова

АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Подпіс ... пацвярджаю
Нач. АК БрДУ.........